# ДЫДАКТЫЧНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ГНС

## Выкарыстанне гульнявых навучальных сітуацый у экалагічным выхаванні дашкольнікаў

Ідэя ўключэння гульні ў працэс навучання маленькіх дзяцей здаўна прыцягвае ўвагу педагогаў і псіхолагаў. К.Д.Ушынскі неаднаразова падкрэсліваў лёгкасць, з якой дзеці засвойваюць веды, калі атрымліваюць іх пры дапамозе гульні. Гэтай жа думкі прытрымліваліся і вядучыя айчынныя педагогі Е.І.Ціхеева, Р.І.Жукоўская, Д.В.Менджарыцкая і інш.

Магчымасць выкарыстання сюжэтна-ролевай гульні ў экалагічным выхаванні дзяцей можна пацвердзіць шэрагам псіхалагічных палажэнняў. А.У.Запарожац падкрэсліваў, што эфектыўнасць навучання ў вялікай ступені залежыць ад эмацыянальных адносін дзіцяці да выхавальніка, які навучае; да задання, якое ён дае дзецям; да ўсёй сітуацыі занятку.

**Якія ж элементы сюжэтна-ролевай гульні павінны пераважаць на экалагічных занятках з дашкольнікамі?** У залежнасці ад навучальнай задачы, яе канкрэтнага праграмнага зместу ў роўнай ступені могуць быць выкарыстаны сюжэтны бок гульні, казачныя ці літаратурныя персанажы, ролевыя адносіны паміж імі і г.д.

У любым выпадку характар гульні поўнасцю вызначаецца логікай пабудовы занятку, які скіраваны на дасягненне дыдактычнай мэты. Таму з самага пачатку і да канца ход гульні рэгламентаваны, яго вызначае выхавальнік: ён загадзя прадумвае, арганізоўвае і накіроўвае гульню ў патрэбны бок.

У апошнія гады намі ажыццяўляецца пошук шляхоў уключэння элементаў сюжэтна-ролевай гульні ў працэс навучання дашкольнікаў і фарміравання ў іх усвядомлена-правільных адносін да раслін, жывёл і сябе як часткі прыроды. На наш погляд, аптымальнай формай уключэння сюжэтна-ролевай гульні ў працэс азнаямлення дашкольнікаў з прыродай з'яўляюцца гульнявыя навучальныя сітуацыі (ГНС). Мы прапануем тры тыпы гульнявых навучальных сітуацый, якія ствараюць розныя дыдактычныя магчымасці:

*1. Гульнявыя навучальныя сітуацыі з выкарыстаннем цацак-аналагаў.*

*2. Гульнявыя навучальныя сітуацыі з выкарыстаннем лялек — літаратурна-казачных персанажаў, а таксама герояў мультфільмаў і тэлеперадач.*

*3. Гульнявыя навучальныя сітуацыі па тыпу сюжэтна-дыдактычных гульняў.*

**Асноўная характарыстыка ГНС першага тыпу—выкарыстанне цацак-аналагаў,** г. зн. такіх цацак, якія адлюстроўваюць розныя аб'екты прыроды.

Неабходна адзначыць, што цацак-жывёл вельмі многа, а цацак-раслін—абмежаваная колькасць. Галоўны сэнс выкарыстання такіх цацак—гэта супастаўленне жывога аб'екта з нежывым аналагам.

Неабходна адзначыць і такую з'яву: выкарыстанне цацак-аналагаў можа быць больш ці менш паспяховым. Прысутнасць цацкі дарэчы кожны раз, калі размова на занятку будуецца на базе атрыманых раней у працэсе назіранняў канкрэтных прыродазнаўчых ведаў. Асабліва добрыя ўмовы ствараюцца, калі з жывёламі немагчымы непасрэдныя сустрэчы. Дзеці з задавальненнем трымаюць у руках цацачную рыбку, птушачку, зайчыка, таму што няма магчымасці ўзяць у рукі жывых істот. І, наадварот, малыя не звяртаюць увагі на цацачнае шчаня, калі на занятку ёсць жывы сабака, які ходзіць, нюхае, гаўкае, якога можна пагладзіць, узяць за лапу.

**Другі тып ГНС звязаны з выкарыстаннем лялек—літаратурна-казачных персанажаў, герояў папулярных мультфільмаў і тэлеперадач,** добра вядомых дзецям. Для гэтай мэты былі выбраны Чыпаліна, Нязнайка і Карлсан.

Абраныя літаратурныя персанажы цікавыя тым, што з іх дапамогай можна актывізаваць пазнавальную дзейнасць дзяцей. Літаратурная біяграфія кожнага з іх дазваляе выкарыстоўваць або яго моцны (дасведчанасць Чыпаліна), або слабы (недасведчанасць Карлсана і Нязнайкі) бакі паводзін у казцы. Менавіта таму Карлсан і Нязнайка трапляюць у такія сітуацыі, калі неабходны веды і дапамога дзяцей.

Такія моманты заняткаў асабліва добрыя тым, што дашкольнікі мяняюць сваю пазіцыю ў навучанні: з навучаемых яны ператвараюцца ў навучаючых. Змена пазіцый выступае як станоўчы фактар навучання—актывізуецца разумовая дзейнасць дзяцей. У традыцыйным занятку выхавальнік заўсёды "над дзецьмі": ён задае пытанні, вучыць, тлумачыць, расказвае—ён дарослы і разумнейшы. Пры выкарыстанні Нязнайкі і Карлсана і іх недарэчных пытанняў і прапаноў, поўнай недасведчанасці ўжо дзеці стаяць "над" імі. Такія суадносіны прыносяць дзецям упэўненасць, яны набываюць годнасць ва ўласных вачах.

**Трэці тып ГНС—розныя варыянты сюжэтна-дыдактычных гульняў.** Напрыклад: "Паездка на выставу", "Экспедыцыя на Паўночны полюс", "Прагулка ў Белавежскую пушчу", "Экскурсія ў заасад" і інш. У ГНС гэтага тыпу вялікую дапамогу зможа аказаць атрыбутыка ў выглядзе самаробных фотаапаратаў, падзорных труб, біноккляў. З іх дапамогай дзеці лепш уваходзяць у ролю, больш робяць гульнявых дзеянняў, а "аптычныя прыборы" ствараюць добрыя візуальныя ўмовы для назіранняў, таму што сваім аб'ектывам яны абмяжоўваюць прастору агляду і засяроджваюць дзіця на канкрэтным прыродным аб'екце.

## ШКОЛА ДЛЯ ЗАЙЧЫКАЎ

**Мэта:** удакладніць з дзецьмі ўяўленне аб тым, што лес—гэта супольнасць розных раслін (у першую чаргу — дрэў) і жывёл. Зайцы-беляхі прыстасаваныя да жыцця ў лесе: увесь год харчуюццаляснымі раслінамі, у іх вострыя зубы, таму яны могуць грызці кару дрэў; маюць маскіровачную афарбоўку поўсці: зімой—белую, летам—шэрую; у іх моцныя і доўгія заднія ногі, якія дазваляюць хутка перамяшчацца скачкамі, абараняцца ад драпежнікаў; яны могуць заблытваць сляды, падоўгу ляжаць на лежні. У зайцоў доўгія вушы, раскосыя вочы, чуйны нюх, таму яны своечасова бачаць і адчуваюць небяспеку.

### *Ход гульні*

Выхавальнік, сабраўшы 8—12 штук самых розных цацачных зайчыкаў, гаворыць дзецям, што заечая кампанія звярнулася да яго з просьбай расказаць пра лес і ўмовы жыцця ў ім, бо некаторыя зайцы агітуюць пакінуць дзіцячы сад і пайсці ў лес. Выхавальнік прапануе дзецям стварыць "школу для зайцоў". Паведамляе, што знайшоў вучоную Саву, якая правядзе з імі ўрок (паказвае цацку-саву, лепшую за бібабо). Потым раздае зайчыкаў усім жадаючым дзецям—яны будуць выконваць іх ролю. Выхавальнік выконвае ролю Савы. Імправізуецца школьны клас: зайцы садзяцца за парты, Сава—за стол настаўніка. Дзецям, якім не хапіла зайчыкаў, але якія хочуць прыняць удзел у гульні, выхавальнік прапануе ролі вучняў гэтага класа.

**Выхавальнік.** Дарагія зайчыкі, мяне запрасілі сюды як вучонага спецыяліста па лясных справах, каб я правяла з вамі ўрок, які папоўніць недахопы ў вашым цацачным жыцці і дазволіць падумаць над суровым жыццём сапраўднага лесу. Падыміце вушы, не касіце вачамі, глядзіце на мяне. Я прынесла карціны пра лес і буду з вамі размаўляць: задаваць пытанні, слухаць адказы, расказваць аб тым, чаго вы не ведаеце.

Спачатку скажыце, ці ведаеце вы, што лес—гэта дом для яго насельнікаў? Хто ж жыве ў гэтым доме? Адказвай, гумавы зайчык *(адказвае дзіця, у якога ў руках гумавы зайчык).* Хто яшчэ? Вось ты, вушасты, скажы *(адказвае дзіця, у якога зайчык з адтапыранымі вушамі).* Правільна, сёетое ведаеце. Лес—гэта месца для жыцця дрэў. Дрэвы ў лесе—самыя галоўныя. Па дрэвах лес называюць па-рознаму: у бярозавым гаі амаль адны бярозы; у дубровах—галоўныя жыхары магутныя дубы; у сасновым бары жывуць зграбныя прыгажуні сосны. У змешаным лесе—і ліпы, і бярозы, і елкі, і іншыя дрэвы. Усе яны ўжываюцца разам.

Але не думайце, зайчыкі, што ў лесе адны дрэвы. У лесе жывуць вялікія кусты, маленькія кусцікі, пад елкамі ў траве растуць грыбы, на светлых мясцінах чырванеюць суніцы. А колькі ў ім жывога: птушкі, жукі, вусені, вялізныя ласі і маленькія лясныя мышкі! А драпежнікаў вы ведаеце? Назавіце іх *(дзеці называюць).*

Але самае галоўнае — у лесе ўсе адзін аднаму патрэбныя, усе звязаны паміж сабой. Кожны знаходзіць сабе ежу, будуе жыллё, выводзіць патомства, ведае, дзе і як можна схавацца, як зіму галодную пераажыць. Таму лес—гэта згуртаванне лясных насельнікаў.

А зараз давайце паглядзім, як зайцы-беляхі прыстасаваны да жыцця ў лесе. Скажыце, як зайцы перамяшчаюцца? Што ім дапамагае? Вось ты падняў лапу, значыць, ведаеш? Выходзь, расказвай! *(Усе дзеці ўважліва слухаюць і дапаўняюць.)*

З нагамі ўсё зразумела: хутка бегаць зайцу дапамагаюць заднія ногі. Яны моцныя і доўгія. Заяц не бегае, а скача, робіць вялізныя скачкі так, што заднія ногі ў яго аказваюцца спераду. Заечыя сляды на снезе—гэта ўсё наадварот: прадаўгаватыя ямкі спераду—ад задніх ног, а круглыя ямкі ззаду—ад пярэдніх. Ёсць такая прыказка: "Зайца ногі кормяць". Як гэта? *(Дзеці павінны растлумачыць.)*

Паглядзіце на карціны. На гэтай—заяц у восеньскім лесе, уцякае, спужаўся лася. Звярніце ўвагу на ногі зайца: заднія намнога даўжэйшыя за пярэднія, і як ён закідвае іх уперад, калі скача. На другой карціне добра відаць сляды зайца. Вось яны, ямкі, пра якія я вам гаварыла. Ліса да іх прынюхваецца, хоча высачыць зайчыка.

А зараз, зайчыкі, пакажыце мне свае ногі. Хіба з такімі кароткімі, слабымі нагамі можна ісці ў лес? Навошта зайцу патрэбна добра бегаць? *(Дзеці адказваюць за сваіх зайчыкаў.)*

Правільна, каб знаходзіць ежу, асабліва ўзімку, калі ўсё ўкрыта снегам. А яшчэ, каб ратавацца ад ворагаў. Іх у зайцоў вельмі многа! Мы пра іх можам спецыяльны ўрок правесці. Вы зразумелі, што зайцу неабходны моцныя ногі? Пасля заканчэння ўрока таксама ідзіце трэніравацца—умацоўваць свае ногі.

Давайце яшчэ пагаворым пра маскіровачную афарбоўку белякоў. Што вы ведаеце, зайчыкі? *(Дзеці адказваюць.)*

> *"У прыроды чыстае сэрца".*
>
> **Хідэа ОГУМА**

Так, поўсць абараняе зайца, робіць яго незаўважным, калі ён знаходзіцца на лежні. Паглядзіце на гэтыя карціны: узімку—адна маскіровачная афарбоўка, улетку—другая. Адбываецца гэта таму, што заяц два разы на год ліняе: адна поўсць выпадае, замест яе вырастае іншая. Але здараецца і такое: напрыклад, восенню снегу яшчэ няма, зямля цёмная, а заяц пачаў ужо бялець, вось тады белае футрачка і выдае яго.

Паглядзіце адзін на аднаго, цацачныя зайчыкі. Якога вы колеру? У што апранутыя? Здаецца, гэта сапраўдны карнавал: і блакітныя, і чырвоныя, і ў клетачку, і з фартушкамі, банцікамі, у камізэльках. Ці магчыма ў такім уборы ісці ў лес і жыць там? Канешне, не! Пасля ўрока падумайце ўсе, як пашыць у атэлье два футры: белае і шэрае. Я думаю, што для першага ўрока дастаткова. А то вы ўсё пераблытаеце і нічога не запомніце. Карціны я вам пакідаю, разгледзьце іх уважліва. Да пабачэння! *(Вучоная Сава развітваецца з дзецьмі да наступнага ўрока.)*

## КАРЛСАН ВЫРОШЧВАЕ АВЁС

**Мэта:** удакладніць з дзецьмі разуменне працэсу сяўбы і вырошчвання аўса, замацаваць веды аб умовах, неабходных для росту раслін; выхоўваць спачуванне да блізкіх, добразычлівыя адносіны да перажыванняў персанажаў гульні.

### *Ход гульні*

Гульнявая сітуацыя выкарыстоўваецца для работы з дзецьмі ўзімку.

Першая частка занятку—навучанне дзяцей прыёмам сяўбы насення аўса (ці іншых злакаў) з мэтай вырошчвання зеляніны для падкормкі жыхароў кутка прыроды (птушак, чарапах, свінак, трусоў, курэй). Дзеці пасеялі насенне ў скрыначкі і пачулі шум прапелера—гэта прыляцеў Карлсан. Ён вітаецца і расказвае дзецям: "Я жыву недалёка—на даху суседняга дома. У мяне ёсць сусед—верабей. Маё любімае варэнне ён не есць, але вельмі любіць крошкі і зярняткі. Я некалькі разоў пралятаў каля вашых вокнаў і бачыў, што вы нешта робіце з зярняткамі. Навошта вы іх закопваеце ў зямлю, лепш дайце мне, я аднясу іх вераб'ю".

Выхавальнік прапануе дзецям растлумачыць Карлсану, навошта яны сеялі авёс, што з яго вырасце, чаму патрэбна зеляніна ўзімку жывёлам. Потым разам дзеці сеюць насенне яшчэ ў адну скрыначку—для Карлсана, каб ён вырасціў зеляніну вераб'ю-суседу. Адны дзеці сеюць, другія тлумачаць госцю, як трэба даглядаць пасеў. Аддаючы скрыначку, раяць яму: "Карлсан, пастаў скрыначку ў цёплае, светлае месца і не забывайся паліваць авёс, інакш ён не вырасце".

Праз два тыдні, калі ў скрыначках з'явілася дружная зеляніна, выхавальнік абмяркоўвае з дзецьмі, якія ўмовы дапамаглі прарасці насенню аўса. Удакладняе, што менавіта наяўнасць усіх неабходных умоў — вады, зямлі, цяпла і святла—дазволіла з'явіцца зялёным усходам.

Ізноў чуваць шум прапелера—прылятае Карлсан са скрыначкай, у ёй зямля пакрылася лёдам. Выхавальнік і дзеці са здзіўленнем разглядваюць вынікі сельскагаспадарчай дзейнасці героя, які жыве на даху. Карлсан вельмі засмучаны, просіць дзяцей растлумачыць, чаму ў яго нічога не вырасла. Калі дзеці самі не здагадаюцца, выхавальнік прапануе паглядзець у акно і сказаць, ці цёпла на вуліцы (а значыць, і на даху) узімку, калі ўсюды ляжыць снег. На заканчэнне гаворым ляльцы: "Ну вось, Карлсан, ты хацяў і намагаўся рабіць усё правільна, але не ўлічыў, што на двары зіма і на марозе насенне не прарастае, а вада ператвараецца ў лёд. Але не засмучайся, дзеці табе дапамогуць!"

Выхавальнік прапануе дапамагчы Карлсану і падараваць некалькі скрыначак з зелянінай для вераб'я.

## ЭКСПЕДЫЦЫЯ ДА ПАЎНОЧНАГА ЛЕДАВІТАГА АКІЯНА

**Мэта:** пазнаёміць дзяцей з суровым кліматам Поўначы, жывёламі, якія жывуць у тых краях, іх прыстасаванасцю да жыцця ў летні перыяд; адзначыць, што белы мядзведзь знаходзіцца пад міжнароднай аховай.

### *Ход гульні*

Выхавальнік гаворыць дзецям, што ў дзіцячы сад прыйшло пісьмо ад палярнікаў з паведамленнем аб тым, што створана спецыяльная дзіцячая экспедыцыя на ўзбярэжжа Паўночнага Ледавітага акіяна. Запрашаюць усіх смелых і адважных дзяцей прыняць у ёй удзел. Самалёт паляціць на Поўнач праз тры дні. Паедзе той, хто здолее добра падрыхтавацца да экспедыцыі.

Падрыхтоўка заключаецца ў наступным: неабходна сабраць папярэднюю інфармацыю пра паўночны край—кнігі, карцінкі, фотаздымкі. Прынесці іх у дзіцячы сад і разам разгледзець. Пазнаёміцца па карце ці глобусе з месцам праходжання экспедыцыі. Патрэніравацца ў праходжанні маршруту з перашкодамі, таму што ў час экспедыцыі давядзецца рухацца па ледзяных глыбах, вузкіх сцяжынках, скакаць цераз расколіны. Да экспедыцыі неабходна падрыхтаваць аснашчэнне для кожнага ўдзельніка: рукзак, цёплы камбінезон ці іншае цёплае адзенне, ахоўныя акуляры, фотаапарат, біноклі, падзорныя трубы, а таксама сухі паёк (маленькая шакаладка ці пячэнне), медыцынскую аптэчку для аказання першай дапамогі.

Пасля азнаямлення з пісьмом пачалося ўваходжанне ва ўяўную сітуацыю экспедыцыі на Поўнач. Ажыццяўляючы "на поўным сур'ёзе" з дзецьмі ўсе этапы падрыхтоўкі, выхавальнік падтрымлівае і паглыбляе яе. У гэтыя тры дні дарослыя прыдумваюць абсталяванне і афармленне фізкультурнай залы пад "узбярэжжа Паўночнага Ледавітага акіяна". Яно можа быць прыкладна наступным: стракатае зялёна-карычневае дыванове пакрыццё адлюстроўвае тундру, дзе пасвяцца паўночныя алені (устанаўліваецца некалькі карцін з выявамі паўночных аленяў, аленявода, сабак).

Разнастайнае фізкультурнае абсталяванне, пакрытае белай тканінай, стварае ўражанне льдзін. ледзяных таросаў, нагрувашчанняў. Усё гэта "плавае ў акіяне" (на падлозе). На некаторых ільдзінах можна ўбачыць паўночных жывёл—белых мядзведзяў, цюленяў і іх сляды. На шведскай сценцы карычнева-шэрай тканінай адлюстравана скала з мноствам птушак (карцінкі). У час гульні ў зале (калі магчыма) уключаецца дадатковае святло (напрыклад, фоталямпа, пражэктар), якое адлюстроўвае яркае сонца ў паўночны дзень.

Да пачатку гульні выхавальнік рыхтуе экіпаж самалёта—3—4 чалавекі (для роляў лётчыкаў, бортмеханіка, сцюардэсы), тлумачыць іх функцыі ў гульні. Перад палётам выхавальнік правярае, ці ўсё ў парадку з атрыбутыкай, тлумачыць план падарожжа, папярэджвае пра цяжкасці і просіць дапамагаць адзін аднаму.

У тундры экспедыцыя сустракае пастуха-аленявода (гэтую ролю выконвае дарослы), які добра ведае мясцовыя ўмовы і таму з ахвотай расказвае і паказвае дзецям паўночны край. Пасля знаёмства з тундрай, аленямі ён вядзе экспедыцыю па льдзінах, паказвае сляды белага мядзведзя, расказвае пра яго. Звяртае ўвагу на цюленя і прапануе占назіраць, як ён плавае. У час пераходаў кіраўнік экспедыцыі (гэтую ролю бярэ на сябе выхавальнік) прапануе надзець акуляры, таму што ад яркага сонца і бліскучага снегу слепнуць вочы, правераць адзенне, адпачыць, перакусіць, патурбавацца пра тых, хто паслізнуўся і ўдарыўся ці змёрз. Кіраўнік таксама нагадвае, каб дзеці сфатаграфавалі тое, што ім спадабалася.

Аленявод ці кіраўнік экспедыцыі расказвае пра тое, што белыя мядзведзі знаходзяцца пад міжнароднай аховай: забаронены іх адстрэл ва ўсіх краінах.

Вярнуўшыся ў імправізаваны самалёт, дзеці здымаюць цёплае адзенне, п'юць ваду, абменьваюцца ўражаннямі аб убачаным і вяртаюцца дадому. Увечары фатографы "праяўляюць" плёнку і робяць фотаздымкі (малюнкі).